Удзячная памяць

# ДРУГІ ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ ГОМЕЛЯ

## Горад першы з абласных цэнтраў адзначыў 80-ю гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

**Фотапраекты, выставы ўзбраення, рэканструкцыі бітваў, аўтапрабегі... У першым вызваленым ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў абласным цэнтры Беларусі да знакавай даты падрыхтавалі мноства мерапрыемстваў, патрыятычных акцый, прымеркавалі адкрыццё муралаў у гонар Герояў Савецкага Саюза.**




80 гадоў мірнага, свабоднага жыцця Гомель адзначыў урачыстым мітынгам каля Вечнага агню. Тут прайшла цырымонія перадачы Сцяга Перамогі. Так абласны цэнтр далучыўся да рэспубліканскай акцыі «На шляху да Перамогі», якая стартавала 23 верасня ў Камарыне — першым вызваленым ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў населеным пункце Беларусі. У адпаведнасці з храналогіяй вызвалення гарадоў і раёнаў эстафету акцыі прыняў Гомель, а перадаў яе Буда-Кашалёва. **Старшыня Гомельскага гарвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ** уручыў Сцяг Перамогі старшыні Буда-Кашалёўскага райвыканкама Анатолю Гапоніку.



— Дзень 26 лістапада, калі войскі 11-й арміі Беларускага фронту пад камандаваннем Ракасоўскага ўвайшлі ў Гомель, стаў яго другім днём нараджэння. Праз 80 гадоў гісторыя паказвае, што мала перамагчы ворага ў адкрытым баі, трэба і ў мірным жыцці не разгубіць плён Вялікай Перамогі. Гомель свята шануе памяць аб героях вайны, аб загінулых воінах і гісторыі нашага народа. Мы зробім усё магчымае, каб наша краіна заставалася моцнай і незалежнай, а жыццё будучых пакаленняў — мірным і шчаслівым, — падкрэсліў Уладзімір Прывалаў.

Гамяльчане розных пакаленняў, працаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый Гомеля сабраліся каля плошчы Працы, каб прывітаць удзельнікаў урачыстага парада. Калонай рарытэтныя машыны, сучасная ваенная тэхніка, разлікі вайскоўцаў, супрацоўнікаў сілавых структур, кадэтаў прайшлі па цэнтральнай вуліцы Гомеля.

Вельмі маштабным атрымалася і мерапрыемства, якое разгарнулася на цэнтральнай гомельскай набярэжнай. Тут прайшла ваенна-гістарычная рэканструкцыя бою на подступах да Гомеля — аднаго з эпізодаў Гомельска-Рэчыцкай наступальнай аперацыі. Як развіваліся падзеі восені 1943 года ў рэканструкцыі паказалі каля ста ўдзельнікаў ваенна-гістарычных клубаў Беларусі.




Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Маштабная выстава ваеннай тэхнікі разгарнулася ў цэнтры Гомеля на плошчы Паўстання. Узоры тэхнікі часоў Вялікай Айчыннай і сучаснага ўзбраення на экспазіцыі размясціліся вакол адной з візітных картак Гомеля — «танка Перамогі» — знакамітага Т-34, які быў устаноўлены на гомельскай плошчы Паўстання ў гонар вызваліцеляў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1968 годзе.

Падарункам для гамяльчан да 80-годдзя вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў стаў унікальны фотадакументальны выставачны праект «80 гадоў міру і стварэння. Гомель — горад з ХХ стагоддзя па цяперашні час». Экспазіцыя пад адкрытым небам размясцілася на агароджы гомельскага цэнтральнага парку. Тут прадстаўлена сорак вялізных банэраў, якія запрашаюць паглыбіцца ў гісторыю горада. На выставе прадстаўлены як шырока вядомыя, так і ўнікальныя фота і дакументы. Падрыхтавала маштабную экспазіцыю каманда спецыялістаў Музея гісторыі Гомеля, Абласнога музея ваеннай славы, Гомельскага палацава-паркавага ансамбля і архіваў.

Да 80-годдзя вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў акцыю «Захаваем гісторыю» правялі Гомельская абласная арганізацыя грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі» і Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі. У аўтапрабегу прынялі ўдзел больш за 80 актывістаў. Удзельнікі ўшанавалі памяць загінулых савецкіх воінаў каля брацкіх магіл на вуліцы Тралейбуснай у Гомелі, ва ўрочышчы Сямень у аграгарадку Пакалюбічы Гомельскага раёна, а таксама каля мемарыяла савецкім воінам у мікрараёне Касцюкоўка. Падчас наведвання месцаў памяці ўдзельнікі аўтапрабегу ўсталявалі інфармацыйныя таблічкі з QR-кодамі.

— Беларусы заўсёды адрозніваліся сваёй гістарычнай памяццю. Вельмі прыемна, што ў акцыі разам прымаюць удзел моладзь, прадстаўнікі працоўных калектываў, актывісты грамадскіх арганізацый, палітычных партый, бо наша задача — захоўваць і перадаваць гістарычную памяць праз пакаленні, — падзяліўся **старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў будаўніцтва і вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, першы сакратар Гомельскага абласнога камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Дзмітрый МУРАШКА,** які паўдзельнічаў у аўтапрабегу разам са сваёй сям'ёй.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Новай Зеландыі прыняў прысягу новы прэм'ер



У Новай Зеландыі прывялі да прысягі новага прэм'ера краіны Крыстафера Люксана, паведаміла выданне The New Zealand Herald. 53-гадовы лідар кансерватыўнай Нацыянальнай партыі на цырымоніі прысягі заявіў, што ўсведамляе «вялікую адказнасць», і паабяцаў прытрымлівацца «самых высокіх стандартаў» у сваёй працы. Ён адзначыў, што збіраецца правесці пасяджэнне кабміна, а таксама наведаць Аўстралію да Каляд. На мінулым тыдні Люксан дамовіўся з дзвюма менш буйнымі партыямі аб стварэнні кааліцыйнага ўрада. У рамках пагаднення пасада намесніка прэм'ера падзелена паміж кіраўнікамі гэтых партый — першыя паўтара года яе будзе займаць 78-гадовы лідар папуліцкай партыі «Новая Зеландыя перш за ўсё» Уінстан Пітэрс, а пасля — лідар правай партыі Дэвід Сеймур. Як вядома, парламенцкія выбары прайшлі ў Новай Зеландыі ў сярэдзіне кастрычніка. Партыя Люксана па іх выніках атрымала 38 працэнтаў галасоў — больш, чым якая-небудзь іншая партыя.

### Вялікабрытанія плануе ўзмацніць жорсткасць выдачы рабочых віз




МУС Вялікабрытаніі плануе ўвесці дадатковыя меры для легальнай міграцыі — павялічыць мінімальны парог заработнай платы і ўвесці абмежаванне на колькасць утрыманцаў для сацыяльных работнікаў, якія ўязджаюць. Аб гэтым са спасылкай на газету Financial Times паведаміла ТАСС. Паводле даных унутрыпалітычнага ведамства, для атрымання рабочай візы штогадовая зарплата кваліфікаваных работнікаў павінна быць не менш як 26,2 тысячы фунтаў стэрлінгаў ($32,8 тыс.), а сацыяльных работнікаў — 20,9 тысячы фунтаў ($26,2 тыс.). Адначасова разглядаецца магчымасць абмежавання колькасці ўтрыманцаў, якія маюць права ўехаць у Злучанае Каралеўства разам з сацыяльным работнікам, які атрымаў рабочую візу. «Утрыманцы, якія прыязджаюць з сацработнікамі, складаюць больш за палову ўсіх людзей, якія прыбываюць у краіну па праграмах працоўнай міграцыі», — канстатуе МУС.

### Полчышчы пацукоў апанавалі пляжы на ўсходзе Аўстраліі

На пляжах аўстралійскага штата Квінсленд — нашэсце пацукоў. Прыморскія гарады кішаць грызунамі, паведаміла «Бі-бі-сі». Улады штата ўжо некалькі месяцаў ваююць з пацукамі і мышамі. Па словах экспертаў, якія прыводзяць мясцовыя СМІ, рэзкае павелічэнне папуляцыі грызуноў прымусіла пацукоў у пошуках ежы перабрацца на ўзбярэжжа, але многія з іх не вытрымліваюць падарожжа. «Пацукі паўсюль, — сказаў агенцтву AFP Дэрэк Лорд, жыхар горада Нармантон. — У нас фірма па пракаце аўтамабіляў, і за адну ноч яны літаральна зжэрлі ўсю праводку ў маторным адсеку адной з машын». Прычына рэзкага павелічэння папуляцыі пацукоў — спалучэнне вільготнага надвор'я, ідэальнага для размнажэння, і багатага ўраджая. Паколькі ў Квінслендзе чакаецца яшчэ больш вільготнае надвор'е, некаторыя лічаць, што горшае яшчэ наперадзе.

Навука

# ІМІТАЦЫЯ ПАЛЁТУ НА МЕСЯЦ

## Супрацоўнік НАН Вольга МАСЦІЦКАЯ прымае ўдзел у ізаляцыйным навуковым эксперыменце «SIRIUS»

**Згодна з інфармацыяй упраўлення аэракасмічнай дзейнасці апарата НАН Беларусі, маштабны міжнародны ізаляцыйны навуковы эксперымент «SIRIUS» Scientific International Research In Unique terrestrial Station (навуковае даследаванне на ўнікальным наземным комплексе), які праводзіцца на базе Дзяржаўнага навуковага цэнтра Расійскай Федэрацыі «Інстытут медыка-біялагічных праблем Расійскай акадэміі навук», стартаваў у 2017 годзе і працягваецца па цяперашні час.**

Мэтай навуковых ізаляцыйных даследаванняў у наземным комплексе з'яўляецца мадэляванне важных падзей у ходзе працяглага знаходжання касманаўтаў на касмічнай станцыі і пры высадцы на іншую планету з мэтай вырашэння праблем медыка-біялагічнага забеспячэння палётаў у далёкі космас.

У рамках праекта «SIRIUS» у 2017—2021 гадах былі праведзены эксперыменты па ізаляцыі міжнародных экіпажаў у наземным комплексе «SIRIUS-17» працягласцю 17 сутак, «SIRIUS-19» — чатыры месяцы і «SIRIUS-21» — восем месяцаў. У склад экіпажаў уваходзілі даследчыкі з Расіі, ЗША, Германіі і ААЭ.

НАН Беларусі прымала ўдзел у падрыхтоўцы этапа «SIRIUS-19». Прадстаўнік НАН Беларусі, супрацоўнік Цэнтральнага батанічнага саду НАН Беларусі Даніїл Дубар прайшоў конкурсны адбор, неабходныя даследаванні і быў залічаны дублёрам у асноўны экіпаж міжнароднага экіпажа наземнага комплексу, а таксама з'яўляўся кандыдатам для ўключэння ў экіпаж наземнага комплексу для васьмімесячнай ізаляцыі.

14 лістапада бягучага года ў Інстытуце медыка-біялагічных праблем РАН пачаўся чарговы эксперымент «SIRIUS-23» па ізаляцыі экіпажа з шасці чалавек для імітацыі палёту на Месяц, які працягнецца 12 месяцаў, але ўжо без удзелу прадстаўнікоў ЗША (у красавіку 2023 года амерыканцы прыпынілі свой удзел у дадзеных эксперыментах).

У апошнім эксперыменце прымае ўдзел прадстаўніца Беларусі — Вольга Масціцкая (малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута фізіка-арганічнай хіміі НАН Беларусі), якая падчас эксперыменту таксама будзе праводзіць пэўныя навуковыя даследаванні ў інтарэсах шэрагу навуковых арганізацый НАН Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**